# У АБАРОНУ НОВЫХ ВОЙНАЎ[1]

**Мары Калдар[2]**

**Abstract**

This article reviews the literature on «new wars». It argues that «new wars» should be understood not as an empirical category but rather as a way of elucidating the logic of contemporary war that can offer both a research strategy and a guide to policy. It addresses four components of the debate: whether new wars are «new»; whether new wars are war or crime; whether the data supports the claims about new wars; and whether new wars are «post-Clausewitzean». It argues that the obsession with the «newness» of wars misses the point about the logic of new wars; that there is a blurring of war and crime but it is important to address the political elements of new wars; that, although the data should be used with caution, it does seem to offer support for some elements of the new war thesis; and that the argument is indeed post-Clausewitzean because new wars are not «contests of wills» but more similar to a mutual enterprise. It concludes that the debate has greatly enriched the overall argument.

## Уводзіны

Глабальныя сістэмы XX стагоддзя былі распрацаваныя для вырашэння міждзяржаўнай напружанасці і грамадзянскіх войнаў. Вайна паміж нацыянальнымі дзяржавамі і грамадзянская вайна маюць пэўную логіку... Гвалт у XXI стагоддзі не ўпісваецца ў форму, звыклую для XX стагоддзя... Гвалт і канфлікт не былі зжытыя... але праз поспех у скарачэнні міждзяржаўных войнаў тыя формы гвалту, якія засталіся, не ўпісваюцца ані ў «вайну», ані ў «мір», таксама як у «палітычны» альбо «крымінальны» гвалт[3].

Ідэя, што арганізаваны гвалт XXI стагоддзя адрозніваецца ад войнаў XX стагоддзя, шырока абмяркоўвалася як у навуковай, так і ў палітычнай літаратуры. Для канцэптуалі-

---

[1] © Mary Kaldor © Stability: International Journal of Security and Development. Арыгінал артыкулу: M. Kaldor: In Defence of New Wars, in: *Stability: International Journal of Security and Development,* 2(1), p. Art. 4 (2013). Рэжым доступу: http://doi.org/10.5334/sta.at. Дата доступу: 20.01.2017.

[2] Мары Генрыета Калдар – прафесар глабальнага кіравання Лонданскай школы эканомікі (Вялікабрытанія), кавалер ордэна Брытанскай імперыі.

[3] *World Bank 2011* // World Development Report 2011: Conflict, Security and development. Рэжым доступу: http://go.worldbank.org/UCTHLNS530 Дата доступу: 20.01.2017

зацыі сучасных канфліктаў былі выкарыстаныя розныя тэрміны: войны між народам (wars among the people), войны трэцяга роду, гібрыдныя войны, прыватызаваныя войны, а таксама новыя войны[4]. Але менавіта тэрмін «новыя», як падаецца, «прыліп» і зрабіўся галоўнай мішэннню крытыкі.

Гэты артыкул абараняе канцэпцыю «новых войнаў». Ва ўзаемадзеянні і супрацьстаянні з рознымі крытычнымі заўвагамі, якія былі вылучаныя супраць тэрміна «новыя», у ёй аргументуецца, што «новае» ў «новых войнах» варта разумець як даследчую стратэгію і кіраўніцтва ў галіне палітыкі. З тае прычыны, што «старое» захавана ў канцэпцыі «новага», гэтае паняцце дазваляе нам змагацца з агульнай логікай, уласцівай сучасным гвалтоўным канфліктам і якая адрознівае іх, такім чынам, ад «старых войнаў». Гэта логіка, якая выходзіць за межы канкрэтных кампанентаў сучасных канфліктаў – палітыкі ідэнтычнасці ці эканамічнага драпежніцтва, напрыклад. Такім чынам забяспечваецца інтэграцыйная рамка для аналізу.

Артыкул скіраваны на чатыры асноўныя напрамкі крытыкі: ці «новыя» гэтыя «новыя войны»; ці ёсць «новыя войны» «войнамі»; ці пацвярджаюцца або абвяргаюцца высновы аб прыродзе «новых войнаў» існуючымі дадзенымі і ці могуць «новыя войны» быць ахарактарызаваныя як «пасляклязўзэвіцыянскія». Перад тым як гэта зрабіць, варта здзейсніць адно папярэджанне. Адна з праблем, якія ўзнікаюць у многіх крытыкаў, палягае ў тым, што яны змешваюць у агульную масу розныя варыянты аргументацыі і разглядаюць крытыку аднаго канкрэтнага аспекту, які змяшчаецца ў адным канкрэтным крытычным падыходзе, як крытыку ўсёй аргументацыі. Такія сцвярджэнні ўключаюць у сябе атаясненне новых войнаў з грамадзянскімі, прэтэнзію, што яны з'яўляюцца барацьбой толькі паміж недзяржаўнымі актарамі і матываваныя толькі эканамічнай выгадай, або што яны больш смяротныя, чым ранейшыя войны[5]. У

---

4 M. Duffield: *Global governance and the new wars: The merging of development and security*, London: Zed Books 2001;
E. Eppler: *Vom Gewaktmärkte zum Gewaltmarkt?* Frankfurt: Suhrkmamp 2002;
C. Hables Gray: *Post-modern war: The new politics of conflict*, London: Routledge 1997;
F. Hoffman: *Conflict in the 21st century; The rise of hybrid wars*, Arlington: Potomac Institute for Policy Studies 2007;
K.J. Holsti: *The state, war and the state of war*, Cambridge: Cambridge University Press 1996;
M. Kaldor: *New and old wars: Organised violence in a global era*, 3rd ed., Cambridge: Polity Press 2012;
H. Munkler: *The new wars*, Cambridge: Polity Press 2005;
R. Smith: *The Utility of Force*, London: Alfred A. Knopf 2005;
D. Snow*: Uncivil wars: International security and the new internal conflicts*, Boulder: Lynne Rienner 1996;
M. Van Creveld: *The transformation of war*, New York: The Free Press 1991.

5 M. Berdal: The 'new wars' thesis revisited, in: H. Strachan, S. Scheipers: *The Changing Character of War*, Oxford: Oxford University Press 2011; B. De Graaff:The wars in former Yugoslavia in the 1990s: Bringing the state

прыватнасці, многія крытыкі выкарыстоўваюць рэдукцыяніскія аргументы, у выніку чаго «новыя войны» асацыююцца з паасобнымі аспектамі сучасных войнаў, напрыклад злачыннасцю, прыватызацыяй або зверствамі, і не прымаюць пад увагу агульную канцэптуальную аснову, якая мае дачыненне да актараў, мэтаў, метадаў і формаў фінансавання. Гэты артыкул паспрабуе пазбегнуць такой пасткі і засяродзіцца на маёй уласнай версіі «новых войнаў»[6]. Перш чым перайсці да дыскусійных момантаў, я пачну з кароткага выкладу спецыфічнага разумення, што такое «новыя войны».

## Логіка новых войнаў

Новыя войны – гэта войны эпохі глабалізацыі. Як правіла, яны маюць месца ў тых рэгіёнах, дзе аўтарытарныя дзяржавы былі значна аслабленыя ў выніку іх адкрыцця астатняму свету. У такіх умовах адрозненні паміж дзяржавай і не-дзяржавай, публічным і прыватным, вонкавым і ўнутраным, эканамічным і палітычным, а таксама вайной і мірам бурацца. Больш за тое, злом гэтых бінарных адрозненняў з'яўляецца як прычынай, так і наступствам гвалту.

У новых войнах ёсць логіка, якая адрозніваецца ад логікі таго, што я называю «старыя войны» – тых ідэй вайны, якія пераважалі ў XIX і XX стагоддзі. У сваёй першапачатковай версіі я вывела гэтую логіку з адрозненняў паміж старымі і новымі войнамі па мэтах, актарах, метадах і формах фінансавання. Гэта:

– Актары. Старыя войны вяліся з дапамогай рэгулярных дзяржаўных узброеных сілаў. Новыя войны вядуцца з дапамогай розных спалучэнняў ланцужкоў дзяржаўных і недзяржаўных актараў – рэгулярных узброеных сілаў, прыватных ахоўных падраздзяленняў, наймітаў, джыхадзістаў, палявых камандзіраў, напаўвайскоўцаў і інш.

– Мэты. Старыя войны вяліся за геапалітычныя інтарэсы ці ідэалогію (дэмакратыю або сацыялізм). Новыя войны вядуцца ў імя ідэнтычнасці (этнічнай, рэлігійнай ці племяннай). Палітыка ідэнтычнасці мае логіку, адрозную ад логікі геапалітычнай ці ідэалагічнай. Мэта палягае ў тым, каб атрымаць доступ да дзяржаўнага кіравання для канкрэтных груп (якія могуць быць як мясцовыя, так і транснацыянальныя), а не праводзіць адмысловыя праграмы або палітычны курс у інтарэсах больш шырокага грамадскага кола. Узнікненне палітыкі ідэнтычнасці звязана з новымі камунікатыўнымі тэхналогіямі, з міграцыяй як з вёскі ў горад, так

back, in: J. Angstrom, I. Duyvesteyn: *The Nature of Modern War: Clausewitz and his Critics Revisited*, Stockholm: Department of War Studies, Swedish National Defence College 2003; S.N. Kalyvas: 'New' and 'old' civil wars: A valid distinction? in: *World Politics,* 54, October (2001), 99–118; P.A. Mellow: Review article: In search of new wars: The debate about the transformation of war, in: *European Journal of International Relations,* 16 (2010), 297. Рэжым доступу: http://dx.doi.org/10.1177/1354066109350053. Дата доступу: 20.01.2017.

[6] Kaldor, op. cit.

і міжнароднай, а таксама разбурэннем больш змястоўных (што часта з'яўляліся дзяржаўнымі) ідэалогій, такіх як сацыялізм і посткаланіяльны нацыяналізм. Магчыма, самае важнае – што палітыка ідэнтычнасці вызначаная вайной. Такім чынам, палітычная мабілізацыя вакол ідэнтычнасці хутчэй з'яўляецца мэтай вайны, чым яе інструментам, як гэта было ў выпадку старых войнаў.

– Метады. У старых войнах бітва мела вырашальнае значэнне. Метад вядзення вайны палягаў у захопе тэрыторыі ваенным шляхам. У новых войнах бітвы рэдкія і захоп тэрыторыі адбываецца палітычнымі сродкамі, шляхам кантролю за насельніцтвам. Тыповы метад – перамяшчэнне насельніцтва, г.зн. прымусовае выдаленне тых, хто мае іншую ідэнтычнасць, ці іншадумцаў. Гвалт у значнай ступені накіраваны супраць грамадзянскіх асоб у якасці спосабу кантролю над тэрыторыяй, а не супраць узброеных сіл праціўніка.

– Формы фінансавання. Старыя войны ў значнай ступені фінансаваліся дзяржавамі (за кошт падаткаў або знешніх патронаў). У слабых дзяржавах падатковыя паступленні падаюць і новыя формы драпежніцкага прыватнага фінансавання ўключаюць рабаванне і марадзёрства, «падаткаабкладанне» гуманітарнай дапамогі, падтрымку дыяспары, выкраданне людзей, кантрабанду нафты, дыяментаў, наркотыкаў, людзей і т.п. Часам сцвярджаюць, што новыя войны прадыктаваныя эканамічнай выгадай, але ў гэтым выпадку цяжка правесці адрозненні паміж тымі, хто выкарыстоўвае прыкрыццё палітычнага гвалту для эканамічных прычын, і тымі, хто займаецца драпежніцкай эканамічнай дзейнасцю для фінансавання сваіх палітычных мэтаў. У той час як старыя ваенныя эканомікі былі, як правіла, цэнтралізаваныя, самадастатковыя і мелі мабілізацыйны рэсурс, новыя войны з'яўляюцца часткай адкрытай глабальнай дэцэнтралізаванай эканомікі, удзел у якой з'яўляецца слабым, а даход залежыць ад працягласці гвалту.

Сэнс гэтых адрозненняў у тым, што ў той час, як старыя войны імкнуліся да скрайнасцяў, паколькі кожны бок спрабаваў выйграць, новыя войны маюць тэндэнцыю распаўсюджвацца і захоўвацца ці паўтарацца, бо кожны бок атрымлівае перавагу ў палітычных ці эканамічных адносінах ад гвалту як такога, а не ад «перамогі» ў ім[7]. У той час як старыя войны былі звязаны з дзяржаўным будаўніцтвам, новыя войны, наадварот, спрыяюць, як звычай, разбурэнню дзяржаў.

Менавіта гэтая настойлівая і ўпартая логіка прывяла мяне да разумення ключавога адрознення новых войнаў ад старых – таго, што я падрабязна разглядаю ў апошнім раздзеле, у якім абмяркоўваецца, ці з'яўляюцца новыя вайны постклязўзэвіцыянскімі. Кляўзэвіц быў тэарэтыкам старых войнаў – згодна з ім вайна была саперніцтвам волі. У маёй версіі новых войнаў вайна – даволі гвалтоўнае прадпрыемства, аформленае палітычна. Важна падкрэсліць, што і старыя, і новыя войны ў маёй фармулёўцы – гэта ідэальныя

[7] Гл.: D. Keen: *Useful enemies: When waging war is more important than winning them*, New Haven: Yale University Press 2012.

тыпы. Яны з'яўляюцца хутчэй ідэалізацыямі войнаў, чым эмпірычным іх апісаннем. Праверка таго, наколькі добра яны адпавядаюць эмпірычнай рэальнасці, залежыць ад таго, ці даюць яны кіраўніцтва для правядзення эфектыўнай палітыкі. Як пойдзе гаворка ў наступных раздзелах, менавіта гэтая думка найбольш часта прапускаецца крытыкамі канцэпцыі новых войнаў.

## Новыя войны сапраўды новыя?

Найбольш распаўсюджаны аргумент супраць новых войнаў – новыя войны не з'яўляюцца новымі. Даказваецца, што халодная вайна затуманіла нашу здольнасць аналізаваць «малыя войны», альбо «войны нізкай інтэнсіўнасці»; што многія з характарыстык новых войнаў, звязаных са слабымі дзяржавамі, могуць быць знойдзеныя ў пачатку сучаснай эпохі, а такія з'явы, як бандытызм, масавыя згвалтаванні, гвалтоўнае перасоўванне насельніцтва або зверствы супраць грамадзянскіх асоб, – усе яны маюць доўгую гісторыю. Вядома, гэта праўда. Многія з асаблівасцей новых войнаў можна знайсці ў папярэдніх войнах. Вядома, дамінаванне канфлікту Усход-Захад зацямняе іншыя тыпы канфліктаў. Але ёсць важная прычына, чаму можна праігнараваць заклапочанасць такіх эмпірычных сцвярджэнняў, выкарыстоўваючы прыметнік «новы».

Крытыкі новых войнаў часта прызнаюць, што самае карыснае ў такім падыходзе – выяўленне палітычнай падаплёкі аргументацыі. Але гэта цалкам слушны пункт гледжання. Тэрмін «новы» – гэта спосаб пазбегнуць «старой» здагадкі аб прыродзе войнаў і паслужыць падставай для новай метадалогіі даследавання. Мэта апісання канфліктаў 90-х як «новых» – змены спосабу даследавання гэтых канфліктаў навукоўцамі і, такім чынам, спосаб для тых, хто вызначае канкрэтную палітыку (policy-makers) і яе агульную форму (policy-shapers), гэтыя канфлікты ўспрымаць. Вызначальнае разуменне гэтых канфліктаў, што ляжаць у аснове палітыкі, бывае двух відаў. З аднаго боку, існуе тэндэнцыя навязаць стэрэатыпную версію вайны, тэндэнцыя, што вынікае з вопыту апошніх двух стагоддзяў у Еўропе, у якой вайна складаецца з канфлікту паміж двума супрацьлеглымі бакамі, звычайна дзяржавамі або протадзяржавамі з легітымнымі інтарэсамі, і гэта я называю «старыя войны». Гэты тэрмін тычыцца стылізаванай формы вайны, а не ўсіх ранейшых войнаў. У такіх войнах рашэнне перамовы або перамога аднаго боку і ўмяшанне звонку прымаюць форму ці традыцыйных аперацый па падтрыманні міру – у якой міратворцы павінны гарантаваць заключанае пагадненне і паноўныя прынцыпы згоды, нейтральнасць і непрадузятасць, – ці традыцыйных баявых дзеянняў з аднаго ці абодвух бакоў, як у Карэі або вайне ў Персідскай затоцы. З іншага – калі дзейныя палітыкі (policy-makers) прызнаюць недахопы гэтага стэрэатыпнага разумення, існуе тэндэнцыя разглядаць гэтыя войны як анархію, варварства, старажытнае саперніцтва, дзе лепшым палітычным адказам з'яўляецца стрымліванне, г.зн. абарона межаў

Захаду ад пералічаных хвароб. Выкарыстанне тэрміну «новы» – гэта спосаб дэманстрацыі таго, што ніводны з гэтых поглядаў не пасуе, што гэтыя войны маюць сваю ўласную логіку, адрозную ад логікі «старых войнаў», і што яны, такім чынам, дыктуюць зусім іншую стратэгію даследаванняў і іншы палітычны адказ. Іншымі словамі, «новыя войны» тычацца як зменлівага характару арганізаванага гвалту, гэтак і распрацоўкі спосабу разумення, інтэрпрэтацыі і тлумачэння ўзаемазвязаных характарыстык такога гвалту.

Як даводзіць Джэйкаб Манды[8] ў адной з самых удумлівых тэзаў у дыскусіі:

«Калі мы вырашылі адмовіцца, прыняць або скарэктаваць такія паняцці, як... новыя войны, нашы меркаванні не павінны быць заснаваныя на патрабаванні сумнеўнай узгодненасці з паасобнымі рэпрэзентацыямі гісторыі. Хутчэй за ўсё, такія паняцці павінны быць ацэненыя з пункту гледжання іх здольнасці звярнуцца да саміх з'яў, што яны імкнуцца палепшыць».

Тым не менш можна сцвярджаць, што ёсць некаторыя сапраўды новыя складнікі сучасных канфліктаў. Насамрэч было б дзіўна, калі б іх не было. Асноўныя новыя элементы павінны быць звязаныя з глабалізацыяй і тэхналогіяй.

У першую чаргу, павелічэнне разбуральнасці і дакладнасці ўсіх формаў ваеннай тэхнікі зрабіла сіметрычную вайну (вайну паміж гэтак жа ўзброенымі сапернікамі) яшчэ больш разбуральнай і таму цяжкай у плане перамогі. Першая вайна ў Персідскай затоцы паміж Іракам і Іранам была, бадай, апошнім па часе прыкладам сіметрычнай вайны – вайны гэткай жа, як і Першая сусветная вайна, якая доўжылася на працягу многіх гадоў і забіла мільёны маладых людзей, амаль без палітычнага выніку. Такім чынам, тактыка ў новых войнах абавязкова павінна лічыцца з гэтым фактам.

Па-другое, новыя формы камунікацый (інфармацыйныя тэхналогіі, тэлебачанне і радыё, танныя паветраныя зносіны) мелі шэраг наступстваў. Нягледзячы на тое, што большасць сучасных канфліктаў вельмі лакальныя, глабальныя сувязі зрабіліся значна больш шырокімі, у тым ліку злачынныя сеткі, сувязі з дыяспарай, а таксама прысутнасць міжнародных арганізацый, НДА і журналістаў. Здольнасць мабілізавацца ці толькі вакол абодвух бакоў, ці вакол правоў чалавека была паскораная новымі камунікацыямі. Камунікацыі таксама становяцца ўсё больш значным інструментам вайны, робячы больш простым, напрыклад, нагнятанне страху і панікі, чым у ранейшыя перыяды, – эфектныя акты тэрарызму. Гэта зусім не значыць, як мяркуе Бэрдал[9], што з гэтага аргумента нібыта вынікае, што ўсе сучасныя войны глабальна звязаныя або што гэтыя сувязі з'яўляюцца абавязкова рэгрэсіўным. Хутчэй за ўсё, гэта толькі элемент у абгрунтаванні логікі новых войнаў.

---

8 J. Mundy: Deconstructing civil wars: Beyond the new wars debate, in: *Security Dialogue*, 42 (2011), 279–295. Рэжым доступу: http://dx.doi.org/10.1177/0967010611405378. Дата доступу: 20.01.2017.

9 Berdal, op. cit.

Па-трэцяе, нават калі можа быць, што, паводле сцвярджэнняў тэарэтыкаў глабалізацыі, апошняя прывяла не да гібелі дзяржавы, а хутчэй да яе трансфармацыі, важна размежаваць розныя шляхі, якімі дзяржавы змяняюцца. Мабыць, найбольш важным аспектам дзяржаўнай трансфармацыі з'яўляецца змяненне ролі дзяржавы ў адносінах да арганізаванага гвалту. З аднаго боку, манаполія на гвалт размываецца зверху, бо некаторыя дзяржавы ўсё часцей далучаюцца да набору міжнародных правілаў і інстытутаў. З іншага – манаполія на гвалт размываецца знізу, бо некаторыя дзяржавы становяцца слабейшымі пад уздзеяннем глабалізацыі. Існуе, можна сцвярджаць, вялікая розніца паміж відамі прыватызаваных войнаў, якія былі характэрныя для дамадэрнага перыяду, і новымі войнамі, якія адбываюцца ў перыяд пасля мадэрну і арыентаваныя на дэзінтэграцыю.

Гэтыя новыя элементы не з'яўляюцца прычынай ужывання прыметніка «новы», аднак, нягледзячы на тое, яны могуць дапамагчы растлумачыць эвалюцыю новых войнаў. Сэнс ужывання прыметніка «новы» не мае дачынення ні да якой-небудзь канкрэтнай асаблівасці сучасных канфліктаў, ні да таго, наколькі добра ён пацвярджае нашы здагадкі пра рэальнасць, хутчэй ён павінен асацыявацца з пэўнай мадэллю вайны і тым, як прааналізаваная мной мадэль адрозніваецца ад цяпер дамінуючых, што ляжаць у аснове палітыкі і ўхваляюцца навуковай супольнасцю. Гэта мадэль, што цягне за сабой пэўную палітычную, эканамічную і ваенную логіку.

Многія крытыкі абыходзяць думку наконт логікі новых войнаў. Напрыклад, як адзначаюць Бэрдал[10] і Малешэвіч[11], палітыка ідэнтычнасці таксама тычыцца ідэй: прыклад таму – ідэя Вялікай Харватыі, сцвярджае Бэрдал. У штодзённым сэнсе гэта дакладна тое ж самае, як магчымасць звесці ідэалагічныя канфлікты таксама да пытання ідэнтычнасці – камуністычнай або фашысцкай у адрозненне, напрыклад, ад этнічнай ці племяннной ідэнтычнасці. Але, калі робіцца падобнае адрозненне, сэнс у тым, каб асвятліць розныя палітычныя логікі, шлях, якім палітыка ідэнтычнасці звязаная з рознымі практыкамі, рознымі метадамі вядзення баявых дзеянняў і рознымі спосабамі стаўлення да ўлады. Палітыка ідэнтычнасці – гэта аб праве на ўладу ў імя пэўнай групы; ідэалагічная палітыка – пра заваёву ўлады для таго, каб ажыццявіць пэўную ідэалагічную праграму. Як правіла, у новай ваеннай сітуацыі доступ да дзяржавы, напрыклад, – гэта доступ да рэсурсаў, а не змяненне паводзін дзяржавы; у такіх сітуацыях канкурэнцыя за ўладу, як правіла, заснаваная на ідэнтычнасці, а не на праграмнай дыскусіі, нават калі апошняя з'яўляецца хутчэй ідэалам, чым рэальнасцю. Гэта дапамагае растлумачыць ваенную тактыку – перасоўванне насельніцтва ў якасці спосабу здзяйснення палітычнага кантролю – або трыванне новых войнаў, паколькі страх з'яўляецца неабходным доўгатэрміновым кампанентам палітыкі

[10] Ibid.

[11] S. Malesevic: *The sociology of war and violence*, Cambridge: Cambridge University Press 2010.

ідэнтычнасці. Бэрдал і Малешэвіч, здаецца, маюць на ўвазе, што тэрмін «палітыка ідэнтычнасці» азначае, што палітыка з'яўляецца маскіроўкай, якая выкарыстоўваецца дзеля эканамічных прычын; вядома, новыя войны палітычныя – менавіта таму яны войны, – і, вядома, ідэнтычнасць цягам іх канструюецца, але гэтаксама ж, як усе іншыя формы ідэалогіі. Справа ў тым, што адрозненне, якое я раблю паміж палітыкай ідэнтычнасці і ідэалогіяй (дэмакратыяй або сацыялізмам) і геапалітычнымі інтарэсамі, мае на ўвазе розны набор палітычных практык і іншую метадалогію вайны.

Некаторыя крытыкі пазіцыі «новых войнаў» кажуць, што гэты тэрмін занадта размаіты – «мяшанка-салянка», сцвярджаюць, прыкладам, Гендэрсан і Сінгэр[12]. Сапраўды, падобныя тэрміны – як гібрыдныя войны, паліварыянтныя войны або комплексныя баявыя дзеянні – гэта відавочна пра тое, што такія войны маюць змешаны характар. Так, напрыклад, «паліварыянтныя баявыя дзеянні» належаць да «спектра канфліктаў, адзначаных нястрыманасцю спосабаў Мэд Макса, у якіх сіметрычныя і асіметрычныя войны зліваюцца і ў якіх Microsoft суіснуе з мачэтэ і тэхналогіі стэлс сустракаюцца з падрыўнікамі-самазабойцамі»[13]. Праблема з існуючымі катэгарызацыямі канфлікту, аднак, заключаецца ў тым, што яны не так наўпрост пасуюць сучаснай рэчаіснасці (думка, якая будзе асветленая ў раздзеле пра дадзеныя), і, такім чынам, палітычныя рэцэпты, якія паходзяць з іх, зблытаныя і скажоныя. Варта спадзявацца, што бягучая дыскусія прывядзе да ўдакладнення канцэпцыі і да з'яўлення новых катэгорый, якія могуць прасунуць азначэнне «новы» ў дачыненні да вайны.

Тыповым прыкладам такога роду крытыкі з'яўляецца артыкул Свэна Хойнацкі. Хойнацкі[14] сцвярджае, што тэрмін «новыя войны» – занадта размаіты, а таксама «метадалагічна праблематычны, паколькі крытэрыі вызначэння «новых» войнаў вельмі адвольныя, з цяжкасцю ўсталёўваюць інтэрсуб'ектыўнасць і з цяжкасцю паддаюцца ўзгадненню з тэорыяй канфлікту». Але потым Хойнацкі працягвае ўсталёўваць ужо свае ўласныя катэгорыі на аснове дзейных асоб – міждзяржаўных, экстрадзяржаўных, унутрыдзяржаўных і субдзяржаўных (inter-state, extra-state, intra-state, and sub-state), – і гэтыя катэгорыі цалкам трапляюць у пазіцыю новых войнаў, у якіх актарамі з'яўляюцца як дзяржаўныя, так і недзяржаўныя, унутраныя і вонкавыя. Ён дакладна адзначае, што тэрмін «новыя войны» – крытыка пануючай тэорыі канфлікту.

12 E.A. Henderson, D. Singer: 'New wars' and rumours of 'new wars', in: *International Interactions,* 28, 2 (2002), 165–190. Рэжым доступу: http://dx.doi.org/10.1080/03050620212098. Дата доступу: 20.01.2017.

13 M. Evans: From Kadesh to Kandahar; Military theory and the future of war, in: *Naval War College Review,* Summer 2003 (2003); Hoffman, op. cit.

14 S. Chojnacki: Anything new or more of the same? Wars and military intervention in the international system 1946–2003, in: *Global Society,* 20, 1 (2006), 25–46. Рэжым доступу: http://dx.doi.org/10.1080/13600820500405442. Дата доступу: 20.01.2017.

Некаторыя крытыкі прызнаюць, што нешта накшталт новых войнаў існуе. Але гэта зусім не азначае, што «старыя войны» сышлі. У прыватнасці, пасля войнаў у Іраку і Афганістане некаторыя навукоўцы і палітыкі папярэджваюць здагадкай пра тое, што наступныя войны стануць падобнымі да іракскай і афганскай. Варта спадзявацца, што наступныя войны не будуць як у Іраку і Афганістане, таму што гэтыя войны пагаршаюцца знешнімі ваеннымі інтэрвенцыямі. Але наступныя войны, верагодна, не будуць падобныя да войнаў XX стагоддзя. Вядома, вяртанне да старых войнаў немагчыма выключыць. Можна ўявіць сабе працяг гонкі ўзбраенняў паміж дзяржавамі, напружанасці паміж імі, якая расце, а таксама схільнасць забываць пакуты папярэдніх пакаленняў. Як выказаўся Джон Кіган: «Вялікая праца па раззбраенні плямёнаў, сект, палявых камандзіраў і злачынцаў – прынцыповае дасягненне манархаў у XVII стагоддзі і імперый у XIX – пад пагрозай: трэба рабіць усё нанова»[15]. Ва ўмовах цяперашняга эканамічнага крызісу, у якім дзяржавы скарачаюць свае ваенныя бюджэты, існуе тэндэнцыя абараніць тое, што разглядаецца як стрыжнёвая абарончая задача – падрыхтоўка да «старой вайны», – і выціснуць здольнасць, што ўзнікае цяпер, да супрацоўніцтва ў глабальных намаганнях прымушэння да міру.

### Ці з'яўляюцца новыя войны «Вайной»?

Некаторыя аўтары сцвярджаюць, што сучасны гвалт у асноўным з'яўляецца прыватызаваным і/або злачынным, і таму не можа быць належным чынам ахарактарызаваны як вайна. Добры прыклад такога роду мыслення – цікавая кніга Джона Мюлера «Парэшткі вайны». Ён сцвярджае, што войны сыходзяць з ужытку і што засталіся бандыты, якія з'яўляюцца «рэшткавымі ўдзельнікамі баёў»[16]. Іншымі словамі, ён вызначае вайну як «старую» вайну. Аналагічнае разважанне было зроблена Мартынам Шоў[17], які гаворыць пра «выраджаныя войны».

Па словах Мюлера, «вялікая частка таго, што сёння адбываецца ў баявых дзеяннях, па сутнасці характарызуецца як апартуністычнае і імправізаванае сутыкненне галаварэзаў, а не наканаванае і зададзенае сутыкненнем цывілізацый, – хаця многія са злачынцаў з асцярожнасцю ўжываць этнічную, нацыянальную або ідэалагічную рыторыку, каб апраўдаць сваю дзейнасць, бо падкрэсліваць вострыя адчуванні і прыбытак ад драпежніцтва будзе палітычна некарэктным»[18].

Шмат сэнсу ў гэтай аргументацыі. Новыя войны могуць быць апісаныя ў выглядзе сумесі вайны (арганізаваны гвалт для дасягнення палітычных мэтаў), злачыннасці (арганізаваны гвалт з асабістымі мэтамі) і парушэнняў правоў чалавека (гвалт у дачы-

[15] Цыт. па: J. Mueller: *The remnants of war*, Ithica: Cornell University Press 2004, 172.

[16] Ibid.

[17] M. Shaw, *War and genocide*, Cambridge: Polity Press 2003.

[18] Mueller, op. cit., 115.

ненні да грамадзянскіх асоб). Перавагай у тым, каб не выкарыстоўваць тэрмін «вайна», з'яўляецца тое, што ўсе формы сучаснага гвалту можна разглядаць як цалкам нелегітымныя, патрабуючыя паліцэйскага, а не палітычнага/ваеннага адказу. Акрамя таго, шмат што ў сучасным гвалце (як наркавойны ў Мексіцы або войны бандаў у буйных гарадах), відавочна, мае логіку, падобную да новых войнаў, але павінна быць класіфікаванае як злачыннасць. Такога ж роду аргумент быў выкарыстаны ў звязку з тэрарызмам. Была шырока распаўсюджаная крытыка тэрміна «вайна з тэрарызмам», таму што гэта мае на ўвазе ваенны адказ на тэрарыстычны гвалт, у той час як больш эфектыўнымі, як сцвярджаецца, былі б паліцэйскія меры і метады выведкі[19].

З іншага боку, палітычны складнік сапраўды неабходна прымаць сур'ёзна; гэта з'яўляецца часткай рашэння. Фармуляванне касмапалітычнай палітыкі ў якасці альтэрнатывы да эксклюзівісцкай ідэнтычнасці з'яўляецца адзіным спосабам усталяваць законныя інстытуты, якія могуць даць кшталт эфектыўнага кіравання і бяспекі, што і прапануе ў якасці рашэння Мюлер. Вайна сапраўды мае на ўвазе арганізаваны гвалт, які служыць палітычным мэтам. Гэта шлях, што легітымізуе злачынную дзейнасць. Смяротнікі-бамбісты ў сваіх развітальных відэа апісваюць сябе як салдат, а не забойцаў. Нават калі гэта такі выпадак, і часта так і ёсць, што тыя, хто залучаюць гвалт у аздобу этнічных, рэлігійных або ідэалагічных тэрмінаў, выконваюць чыста інструментальную ролю, гэтыя палітычныя наратывы інтэрнацыяналізуюцца праз працэсы ўцягнення ў гвалт або трывання ад яго. Насамрэч гэта пункт гледжання з пазіцыі гвалту; гэта дазваляе выйграць выбары ці мабілізаваць палітычную падтрымку шляхам палітыкі страху. Гэтую заўвагу трапна зрабіў Калівас у сваёй «Логіцы гвалту ў грамадзянскіх войнах». Ён цытуе Фукідыда, што да «гвалтоўнага фанатызму, які ўступіў у гульню пасля таго, як пачалася барацьба... Грамадства зрабілася падзеленым на два ідэалагічна варожыя лагеры, і кожны з бакоў разглядаецца іншым з падазрэннем»[20]. Пераадоленне страху і варожасці не абавязкова адбываецца шляхам кампрамісу, нават калі гэта магчыма, таму што кампраміс можа замацаваць пазіцыі выключнасці; але гэта патрабуе іншага роду палітыкі, будаўніцтва агульнага дыскурсу, які павінен ляжаць у аснове любой праватвой рэакцыі.

Адпаведная тэрміналагічная праблема тычыцца і слова «канфлікт». Існуе юрыдычная розніца паміж «вайной» і «ўзброеным канфліктам», які мае дачыненне да таго, ці была вайна афіцыйна абвешчаная. Большасць баз дадзеных прапануюць парог, ніжэй якога гвалт не можа быць расцэнены як вайна, – прыкладам, тысячу смерцяў з-за бітваў у год, як у базе дадзеных Correlates of War (Correlates of War Project). Не жадаючы празмерна ўдавацца ў се-

19 M. Howard: What's in a name? in: *Foreign Affairs*, January/February 2002 (2002).

20 S.N. Kalyvas: *The logic of violence in civil wars*, Cambridge: Cambridge University Press 2006, 78.

мантыку, тэрмін «канфлікт», як уяўляецца, мае на ўвазе аспрэчванні, якія тычацца законнай незадаволенасці і якія могуць быць вырашаныя альбо шляхам перамогі аднаго з бакоў, або шляхам кампрамісу; тэрмін, які выкарыстоўваецца ў Базе дадзеных канфліктаў Упсальскага ўніверсітэта (the Uppsala University Conflict Dataset), – «аспрачальная несумяшчальнасць»[21]. Насамрэч канфлікт носіць эндэмічны характар ва ўсіх грамадствах і з'яўляецца неабходным для змены і адаптацыі. Дэмакратыя ўяўляе сабой мірны механізм урэгулявання канфліктаў. Гвалт, як сцвярджае Мішэль Вівёрка[22], мае тэндэнцыю быць процілегласцю канфлікту; ён спыняе дэбаты і «заклікае да разрыву стасункаў». У новых войнах «бакам» патрэбна «несумяшчальнасць», каб апраўдаць сваё існаванне.

## Дэбаты аб дадзеных

Довад на карысць ужывання панятка «новыя войны» ў значнай ступені заснаваны на якасных, а не колькасных дадзеных. Ён выйшаў з эмпірычных даследаванняў войнаў у былой Югаславіі і на Паўднёвым Каўказе, а таксама на поўдзень ад Сахары[23]. Гэтыя веды з тых часоў былі дапоўненыя даследаваннямі ў Іраку і Афганістане, але былі два колькасныя патрабаванні, якія я выкарыстала для падтрымкі аргумента, што баі робяцца рэдкімі і найчасцей гвалт скіраваны супраць грамадзянскіх асоб. Першы датычыць рэзкага павелічэння страт у суадносінах грамадзянскіх асоб да ваенных, а другі тычыцца росту колькасці перамешчаных праз канфлікт асоб. Іншыя дадзеныя, якія могуць быць карыснымі, звязаныя з рэцыдывам і/або захаваннем сучасных канфліктаў, а таксама тэндэнцыяй да іх распаўсюджвання.

Насамрэч колькасныя дадзеныя, нягледзячы на заявы аб адваротным, здаецца, сапраўды пацвярджаюць аргументы аб прыродзе новых войнаў, нават калі гэтыя дадзеныя будуць выкарыстоўвацца з асцярожнасцю, таму што яны ў значнай ступені абумоўлены «старымі» ўяўленнямі пра канфлікт. Спрэчкі аб дадзеных ахопліваюць тры шырокія вобласці: колькасць і працягласць войнаў; колькасць ахвяр; узроўні прымусовага перамяшчэння.

## Колькасць і працягласць войнаў

Існуюць тры асноўныя крыніцы дадзеных аб колькасці войнаў. Гэта:

– Упсальская праграма дадзеных аб канфліктах (UCDP)[24], якая выкарыстоўваецца Стакгольмскім міжнародным інстытутам да-

[21] *Definition of Armed Conflict*, in: UCDP Department of Peace and Conflict Research, Uppsala University 1988. Рэжым доступу: http://www.pcr.uu.se/research/ucdp/definitions/definition_of_armed_conflict/. Дата доступу: 20.01.2017.
[22] M. Wieviorka: *Violence: A new approach*, London: Sage Publications 2009.
[23] M. Kaldor, B. Vashhee (eds.): *New Wars*, London: Pinter Press 1997.
[24] UCDP Department of Peace and Conflict Research, op. cit.

следаванняў праблем свету (SIPRI)[25] у іх штогодніку, Праект Справаздачы па пытаннях бяспекі чалавека (the Human Security Report project)[26] і Сусветны Банк (the World Bank);

– The Correlates of War Project[27] ва Універсітэце штата Мічыган;

– Біенале даследавання міру і канфліктаў (Peace and Conflict Survey)[28], арганізаванае Цэнтрам развіцця і кіравання канфліктамі пры Універсітэце штата Мэрыленд.

Усе тры базы дадзеных заснаваныя на ўяўленнях аб «старой вайне». Для таго каб гвалт быў расцэнены як вайна, павінен быць удзел дзяржавы, прынамсі з аднаго боку, і павінна быць пэўная колькасць баявых смерцяў. Акрамя таго, усе яны адрозніваюць унутрыдзяржаўныя і міждзяржаўныя войны, а некаторыя з іх дадалі катэгорыі «субдзяржаўныя» або «недзяржаўныя». Аднак цэнтральнае месца ў аргуменце за выкарыстанне тэрміна «новыя войны» займае цяжкасць у адрозніванні паміж тым, што з'яўляецца дзяржавай, а што не, і што такое знешняе, а што – унутранае. Такім чынам, нішто з пералічанага не здольнае ахапіць прыроду новых войнаў.

У прыватнасці, акцэнт на баявых смяротных выпадках мае нелагічны эфект: неразгледжанымі застаюцца буйныя эпізоды гвалту. Як піша Мілтан Лейтэнбэрг[29]: «Было некалькі «баявых смерцяў» у Камбоджы ў перыяд паміж 1975 і 1978 гадамі, параўнальна мала ў Самалі ў 1990 і 1991 гадах або ў Руандзе ў 1994 годзе; але гэта было б проста дзіўна, калі б два мільёны мёртвых у Камбоджы, 350 000 у Самалі і 8000 ці больш у Руандзе былі выключаныя з падборкі».

Тым не менш высновы з трох баз дадзеных маюць пэўнае дачыненне да канцэпцыі «новай вайны». Усе яны, як правіла, супадаюць у меркаванні, што да наступных высноў:

– фактычнае знікненне войнаў паміж дзяржавамі;

– зніжэнне ўсіх войнаў высокай інтэнсіўнасці, дзе адбываецца больш за тысячу баявых смерцяў;

– зніжэнне смяротнасці з-за вайны, вымеранай з пункту гледжання баявых страт;

– павелічэнне працягласці і/або паўтарэння войнаў;

– фактар рызыкі блізкасці да іншых войнаў.

Іншымі словамі, сапраўды так падаецца, што адбываецца скарачэнне «старых войнаў», што ў значнай ступені суадносіцца з дадзенымі. Адзначаецца таксама зніжэнне колькасці загінулых у баях,

---

25 Сайт Інстытуту размешчаны па адрасе: http://www.sipri.org.

26 Human Security Report, Рэжым доступу: http://www.hsrgroup.org. Дата доступу: 20.01.2017.

27 Correlates of War Project, Рэжым доступу: http://www.correlatesofwar.org. Дата доступу: 20.01.2017.

28 Peace and Conflict, Centre for International Development and Conflict Management, University of Maryland. Рэжым доступу: http://www.cidcm.umd.edu/pc/. Дата доступу: 20.01.2017.

29 M. Leitenberg: *Deaths in war and conflicts in the 20th century,* (Occasional paper no. 29) Ithaca, NY: Cornell University Peace Studies Program, 3rd edition, 2006.

што ўзгадняецца з аргументам аб змяншэнні колькасці бітваў. І падобна, ёсць доказы таго довада, што новым войнам цяжка пакласці канец і яны маюць тэндэнцыю распаўсюджвацца, калі мы робім дапушчэнне, што дадзеныя сапраўды ўлавілі складнікі некаторых новых войнаў.

UCDP прыклала найбольшыя намаганні, каб прыстасавацца да новых рэалій, і дадала звесткі па эпізодах аднабаковага гвалту і недзяржаўных гвалтоўных канфліктах. Абедзве гэтыя лічбы, здаецца, растуць, і гэта зноў-такі ўзгадняецца з аргументам, што новыя войны могуць разглядацца як выпадкі ўзаемнага аднабаковага гвалту і ў нашы дні могуць быць больш тыповымі працяглыя канфлікты нізкага ўзроўню, нізкай інтэнсіўнасці.

Тыя, хто крытыкаваў довады на карысць канцэпцыі «новых войнаў» з дапамогай такога роду дадзеных, як правіла, выкарыстоўвалі дэмагагічныя прыёмы. У такім разе сцвярджаецца, што новыя войны – гэта войны грамадзянскія, і памяншэнне ліку грамадзянскіх войнаў тады азначае, што новыя войны не павялічваюцца. Але новыя войны не тое ж самае, што грамадзянскія войны, і ніхто не сцвярджаў, што новыя войны павялічваюцца або памяншаюцца; ідэя заўсёды была ў тым, як змяняецца характар вайны. Дзіўнавата, але крытыкі таксама выказалі меркаванне, што зніжэнне жорсткасці баявых дзеянняў з'яўляецца крытыкай новых войнаў, калі, наадварот, гэта пацвярджае довады на карысць новых войнаў[30].

## Страты

Праблема з разлікамі ў суадносінах ваенных страт да страт сярод грамадзянскіх асоб мае тры складнікі. Па-першае, дадзеныя пра ахвяры сярод грамадзянскага насельніцтва, як вядома, недакладныя. Ёсць цэлы шэраг метадаў разліку гэтых лічбаў: звесткі аб асобных смяротных выпадках, якія абапіраюцца на медыя і іншыя справаздачы, эпідэміялагічныя абследаванні, апытанні грамадскай думкі і афіцыйныя пасведчанні аб смерці, калі такія маюцца. Вынікі адрозніваюцца ў шырокіх межах. Такім чынам, страты ў вайне ў Босніі – ад 260 000 (згодна з дадзенымі Баснійскага Міністэрства інфармацыі, лічба шырока выкарыстоўвалася міжнароднымі агенцтвамі ў той час), з якіх 60 000 былі ваеннымі, да 40 000 у Дакладзе аб сусветных катастрофах[31] (World Disasters Report). Аналагічным чынам грамадзянскія страты ў вайне ў Іраку былі прадметам велізарных дэбатаў; лік мог адрозніваўца ў шырокіх межах, ад прыкладна 100 000 ахвяр гвалту сярод грамадзянскага насельніцтва (як вынікае з

[30] E. Melunder, M. Oberg: Are 'New Wars' More Atrocious? Battle Severity, Civilians Killed and Forced Migration Before and After the End of the Cold War, in: *European Journal of International Relations*, 15 (2009), 505. Рэжым доступу: http://dx.doi.org/10.1177/1354066109338243. Дата доступу: 20.01.2017.

[31] A. Roberts: Lives and statistics: Are 90% of war victims civilians? in: *Survival* 52, 3 (2010), 115–136.

ацэнкі 2011 г. Iraq Body Count[32], якая абапіраецца на паведамленні СМІ і афіцыйных дакументаў) да больш за мільён (на аснове грамадскага апытання ў 2007 годзе, калі былі апытаныя іракцы з усіх 18 правінцый, ці быў забіты член іхняй сям'і)[33].

Па-другое, вельмі цяжка адрозніць баевікоў ад грамадзянскіх асоб. Адзіныя лічбы, для якіх маецца дакладная статыстыка, гэта дадзеныя вайсковых страт, паколькі яны афіцыйна рэгіструюцца ўрадамі. Такім чынам, мы ведаем, што па стане на верасень 2012 года налічвалася каля 4804 страт вайскоўцаў у Іраку, з якіх 4486 былі амерыканскімі, і прыблізна 3202 – ваенныя страты ў Афганістане, з якіх прыкладна 2136 былі амерыканскімі (Iraq Coalition Casualty Count)[34]. Але, паколькі многія баевікі ў новых войнах маюць дачыненне да паліцыі, міліцыі, прыватных войскаў, найміпаў, параміліпарных сілаў або злачынцаў рознага кшталту, лічбы для іншых ваенных і грамадзянскіх ахвяр вельмі цяжка ідэнтыфікаваць. Добрым прыкладам з'яўляюцца лічбы, атрыманыя Сараеўскім цэнтрам даследаванняў і дакументацыі. Цэнтр збіраў пасведчанні аб смерці людзей, якія загінулі ў вайне 1992–1995, і, згодна з іх ацэнкамі, каля 97 207 чалавек былі забітыя, з якіх 39 684, або 41%, складалі грамадзянскія асобы і 62 626, або 59%, – жаўнеры. Тым не менш у лік жаўнераў былі ўключаны ўсе мужчыны прызыўнага ўзросту. Бо мы ведаем, што забітыя ў аперацыях этнічных чыстак – гэта ў асноўным мужчыны прызыўнага ўзросту, і большасць перамешчаных асоб складалі жанчыны. І мы таксама ведаем, што ўдзел у гвалтоўных дзеяннях быў вельмі нізкім, каля 6,5% насельніцтва, таму проста не выклікае даверу тое, што ўсе гэтыя людзі былі жаўнерамі. Гэта было б усё роўна як меркаваць, прыкладам, што амаль усе 8000 мужчын і хлопчыкаў, забітых у Срэбраніцы, – жаўнеры.

Па-трэцяе, вельмі цяжка адрозніць, былі забітыя грамадзянскія асобы ў выніку пабочнага эфекту бітвы, у выніку наўмыснага гвалту (палітычнага ці крымінальнага) або ў выніку ўскосных наступстваў вайны – нястачы і хвароб. У Дакладзе аб бяспецы чалавека мяркуецца, што смяротныя выпадкі як ўскоснае ўздзеянне вайны зменшыліся ў сучасных войнах. Гэта адбываецца таму, што войны часта моцна лакалізаваныя і маюць нізкую інтэнсіўнасць, і з прычыны агульнага паляпшэння ў галіне аховы здароўя або імунізацыі, якая працягваецца падчас войнаў. Асноўны метад разліку гэтых ускосных эфектаў ажыццяўляецца праз вылічэнне залішніх смерцяў, якія мелі месца звыш таго, што можна было чакаць ад папярэдніх тэндэнцый. Даклад аб бяспецы чалавека, напрыклад, крытыкуе справаздачу IRC[35] пра страты ў вайне ў Дэмакратычнай

32 Iraq Body Count. Рэжым доступу: http://www.iraqbodycount.org/. Дата доступу: 20.01.2017.

33 ORB International Available. Рэжым доступу: http://www.opinion.co.uk. Дата доступу: 20.01.2017.

34 Iraq Coalition Casualty Count. Рэжым доступу: http://icasualties.org/. Дата доступу: 20.01.2017.

35 The International Rescue Committee. Рэжым доступу: https://www.rescue.org. Дата доступу: 20.01.2017.

Рэспубліцы Конга, згодна з ацэнкамі якога 5,4 мільёна чалавек памерлі ў часе вайны, якія не памерлі б, «калі б ніякай вайны не было»; больш чым 90% з іх, паводле ацэнак, памерлі ад вайны, якая пагоршыла хваробы і недаяданне. ДБЧ (HSR) сцвярджае, што іх ацэнка была заснаваная на меркаванай дзіцячай смяротнасці да канфлікту, якая была занадта прыніжаная, што гэтыя даследаванні былі неаб’ектыўныя для раёнаў з невялікай доляй насельніцтва і высокай смяротнасцю і што сапраўдная лічба, верагодна, значна ніжэйшая.

Дык што ж можна сказаць пра дадзеныя па стратах? Перш за ўсё, дадзеныя дазваляюць выказаць здагадку, што адбываецца агульнае зніжэнне ўсіх смерцяў, звязаных з вайной. Адна з крытычных заўваг, зробленых з непаразумення тэзісаў канцэпцыі новых войнаў, – быццам прыхільнікі канцэпцыі «новых войнаў» сцвярджаюць, што зверствы падчас такіх войнаў горшыя, чым у папярэдніх войнах. Але адзінае сцвярджэнне, якое робіць канцэпцыя «новых войнаў», – гэта тое, што большасць выпадкаў гвалту ў новых войнах тычыцца гвалту ў дачыненні да грамадзянскіх асоб, а не падчас баявых дзеянняў; было б вар’яцтвам сцвярджаць, што гвалт у дачыненні да грамадзянскіх асоб горшы, чым зверствы, учыненыя дзяржавамі ў эпоху мадэрну, такія як Халакост або савецкія чысткі. Па-другое, назіраецца рэзкае зніжэнне баявых страт. Калі мы параўнаем усе звязаныя з вайной смерці са смярцямі ў бойках, а не долю грамадзянскіх асоб у ваенных стратах, то можна сцвярджаць, што суадносіны павялічыліся ў маштабах, сувымерных з першапачатковай прэтэнзіяй, высунутай канцэпцыяй «новай вайны»[36]. Па-трэцяе, страты сярод звычайных салдат з’яўляюцца вельмі невялікай часткай ад агульнага ліку смерцяў у войнах: і таму, што стала менш жаўнераў рэгулярнай арміі, якія прымаюць удзел у войнах, і праз памяншэнне колькасці саміх баёў.

І, нарэшце, самае шакуючае ва ўсёй гэтай дыскусіі: у нас ёсць добрыя і дакладныя статыстычныя дадзеныя аб гібелі людзей у вайсковай уніформе, але інфармацыі аб пераважнай большасці ахвяр зусім не дастаткова.

### Прымусовае перамяшчэнне

Ніхто не спрачаецца, што ў цэлым агульная колькасць перамешчанага насельніцтва павялічылася. Насамрэч па звестках АНВКБ (UNHCR)[37] дадзеныя адносна гвалтоўна перамешчаных асоб у 2010 годзе былі самымі высокімі за пятнаццаць год і склалі 43,7 мільёна чалавек, у тым ліку 15,4 мільёна бежанцаў, каля 27,5

---

36 B. Lacina, N.P. Gleditsch: Monitoring trends in global combat: A new dataset of battle deaths, in: *European Journal of Population,* 21 (2005), 145–166. Рэжым доступу: http://dx.doi.org/10.1007/s10680-005-6851-6. Дата доступу: 20.01.2017.

37 United Nations High Commissioner for Refugees (UNHCR). Рэжым доступу: http://www.unhcr.org/. Дата доступу: 20.01.2017.

мільёна ўнутрана перамешчаных асоб і 837 500 асоб, чые заявы аб наданні прытулку не былі апрацаваныя. Але крытыкі мяркуюць, што гэтыя лічбы павінны быць перакваліфікаваныя з дзвюх прычын. Па-першае, збор дадзеных значна палепшыўся, асабліва ў дачыненні да асоб, перамешчаных унутры краіны. У прыватнасці, асноўнай крыніцай дадзеных па ўнутрана перамешчаных асобах (УПА) з'яўляецца Цэнтр назірання за працэсамі ўнутранага перамяшчэння Нарвежскага савета па справах бежанцаў (ЦНСБ/НСБ)[38], які займаецца толькі зборам дадзеных з 1998 года. Да гэтага часу асноўнай крыніцай былі ацэнкі АНВКБ па тых УПА, якія выклікаюць заклапочанасць самой АНВКБ, і гэта давала значна больш нізкі паказчык. Па-другое, дадзеныя аб бежанцах і змушаных перасяленцаў, як правіла, назапашваюцца, бо многія людзі не вяртаюцца ў свае дамы.

Тым не менш нядаўнія канфлікты – асабліва ў Іраку, Самалі і Пакістане – сапраўды, здаецца, пацвярджаюць той пункт гледжання, што прымусовае перамяшчэнне з'яўляецца цэнтральным у метадалогіі новых войнаў. У Іраку, напрыклад, каля 4 млн чалавек былі перамешчаныя ў разгар вайны ў 2006–2008 гг.; прыкладна палова з іх былі бежанцамі і палова – перамешчаныя ўнутры краіны. Насамрэч можна сцвярджаць, што адна з прычын для зніжэння ўзроўню смяротнасці ў вайне палягае ў тым, што лягчэй пасеяць страх і паніку, выкарыстоўваючы новыя камунікацыі, таму ўсё больш людзей пакідаюць свае дамы, чым гэта было раней. У той жа час, як уяўляецца, існуе тэндэнцыя да павелічэння такіх перамяшчэнняў праз канфлікт. Выкарыстоўваючы дадзеныя Амерыканскага савета па справах бежанцаў, Майрон Ўэйнэр[39] падлічыў, што колькасць бежанцаў і ўнутрана перамешчаных асоб у канфлікце павялічылася з 327 000 за часамі канфлікту ў 1969 годзе да 1 316 000 у 1992 годзе (1992 год быў, вядома, пікавым годам канфлікту). Пры выкарыстанні Упсальскай базы дадзеных аб канфліктах і графікаў АНВКБ (UNHC) і ЦНСБ (IDMC) у канфліктах можна назіраць тэндэнцыю росту колькасці бежанцаў і ўнутрана перамешчаных асоб. Графік 1 з'яўляецца шырэйшым, паказвае рост штогадовай колькасці ўнутрана перамешчаных асоб у краінах, якія перажываюць не толькі ўзброеныя канфлікты, але і тое, што Упсальская праграма дадзеных аб канфліктах (UCDP) апісвае як субдзяржаўныя (substate) канфлікты і аднабаковы гвалт.

Адной з высноў, што вынікаюць з гэтага абмеркавання, з'яўляецца неабходнасць удакладніць дадзеныя па перамяшчэннях, якія таксама маглі б слугаваць лепшым паказчыкам чалавечай бяспекі, чым некаторыя з тых лічбаў, што выкарыстоўваюцца звычайна.

---

38 Internal Displacement Monitoring Centre, Norwegian Refugee Council. Рэжым доступу: http://www.internal-displacement.org. Дата доступу: 20.01.2017.

39 M. Weiner: 'Bad neighbours, bad neighbourhoods: an inquiry into the causes of refugee flows' in: *International* Security, 21, 1 (1996), 5–42.




Гр.1. Рост штогадовай колькасці УПА ў краінах, якія перажываюць узброеныя канфлікты, субдзяржаўныя канфлікты і аднабаковы гвалт.

## Дыскусія пра Кляўзэвіца

Апошні набор крытычных заўваг супраць канцэпцыі «новых войнаў» звязаны са сцвярджэннем, што новыя войны – посткляўзэвіцыянскія[40]. Довады, якія звычайна высоўваюцца для пацвярджэння, што новыя войны посткляўзэвіцыянскія, маюць дачыненне да трынітарнай канцэпцыі вайны, прымату палітыкі і ролі розуму. І Джон Кіган[41] і Мартын Ван Крэвельд[42] выказалі здагадку, што трынітарная канцэпцыя вайны, з яе трохбаковым адрозненнем дзяржавы, арміі і народа, ужо не актуальная. Іншыя аўтары мяркуюць, што вайна больш не з'яўляецца інструментам палітыкі і насамрэч «аддзяленне вайны ад палітыкі» характэрна як для дакляўзэвіцыянскіх, гэтак і посткляўзэвіцыянскіх войнаў[43]. Разам з гэтымі аргументамі крытыкі таксама паставілі пад сумнеў рацыянальнасць вайны. Ван Крэвельд, напрыклад, сцвярджае, што «недарэчна... думаць, што толькі таму, што некаторыя людзі валодаюць уладай, яны дзейнічаюць як вылічальныя машыны, якія не паддаюцца ўплыву жарсцяў. Па сутнасці, яны з'яўляюцца не больш рацыянальнымі, чым усе астатнія»[44].

Гэтыя аргументы даволі трывіяльныя, і ў залежнасці ад таго, як інтэрпрэтаваць Кляўзэвіца, усе яны могуць быць абвергнутыя. Х'ю Стракан[45] паказвае, што трынітарнасць з'яўляецца «тэндэнцыяй» альбо матывацыяй, а не эмпірычнай катэгорыяй. Сутнасць гэтай

---

40 H. Stracan, A. Herbheg-Rothe: *Clausewitz and the twenty first century*, Oxford: Oxford University Press 2007.
B. Schuurman: Clausewitz and the 'new wars' scholars, in: *Parameters*, Spring 2010 (2010), 89–100.

41 J.A. Keegan: *History of warfare*, London: Pimlico 2004.

42 Van Creveld, op. cit.

43 D. Snow, цыт. па: J. Angstrom: Introduction. In: J. Angstrom, et al. *The Nature of Modern War: Clausewitz and his Critics Revisited*. Stockholm: Department of War Studies, Swedish National Defence College 2003, 8.

44 Van Creveld, op. cit., 10.

45 H. Strachan: *Carl Von Clausewitz's 'On war': A book that shook the world*, London: Atlantic Books 2007.

канцэпцыі палягае ў тым, каб растлумачыць, як складаная сацыяльная арганізацыя, якая ўтвараецца з многіх розных людзей з разнастайнымі матывамі, можа стаць, паводле яго слоў, «персаніфікаванай дзяржавай» – «бокам», або ўдзельнікам вайны. «Вайна, – кажа Кляўзэвіц, – такім чынам, не толькі па сваім характары хамелеон, бо яна змяняе колер у той ці іншай ступені ў кожным канкрэтным выпадку, але яна таксама ў цэлым, у сувязі з пераважнымі тэндэнцыямі, якія маюць месца быць, утварае выдатную тройцу, якая складаецца з першапачатковых складнікаў гвалту – нянавісці і варожасці, якія можна разглядаць у якасці сляпога інстынкту; гульні верагоднасцяў і выпадковасці, якія робяць яе свабоднай дзейнасцю душы; і падначаленай прыроды палітычнага інструмента, праз пасрэдніцтва чаго яна належыць чыстаму розуму»[46]. Гэтыя розныя «тэндэнцыі» – розум, выпадковасць і эмоцыі – у асноўным звязаныя адпаведна з дзяржавай, генералітэтам і народам, але словы «ў асноўным» або «больш» наводзяць на думку, што яны не наўпрост звязаныя з гэтымі рознымі кампанентамі ці ўзроўнямі вядзення вайны.

Кляўзэвіц сцвярджае, што вайна з'яўляецца тым, што яднае трынітарнасць. Трынітарнасць была «дзівоснай», таму што зрабіла магчымым збліжэнне народа і сучаснай дзяржавы. Відавочна, што адрозненне паміж дзяржавай, узброенымі сіламі і народам размытае ў большасці новых войнаў. Новыя войны вядуцца сеткамі дзяржаўных і недзяржаўных суб'ектаў, і часцяком цяжка правесці мяжу паміж баевікамі і грамадзянскімі асобамі. Такім чынам, калі мы думаем пра трынітарнасць з пункту гледжання інстытутаў дзяржавы, арміі і народа, то яна не можа ўжывацца. Але калі мы думаем пра трынітарнасць як канцэпцыю для тлумачэння таго, як разнастайныя сацыяльныя і этычныя тэндэнцыі аб'ядноўваюцца ў вайне, то яна відавочна вельмі актуальная.

Другой праблемай з'яўляецца прымат палітыкі. Сярод перакладчыкаў Кляўзэвіца ёсць дэбаты аб тым, ці варта нямецкае слова Politik перакладаць як знешнюю палітыку (policy) або як палітыку ўнутраную (politics). Можна сцвярджаць, што гэта адпаведна таму, калі мы груба вызначаем знешнюю палітыку з пункту гледжання стасункаў з іншымі дзяржавамі, а таксама ўнутраную, як унутраны працэс апасродкавання розных інтарэсаў і поглядаў.

Новыя войны таксама змагаліся за палітычныя мэты, і насамрэч вайну саму па сабе можна разглядаць як адну з формаў палітыкі. Палітычны наратыў супрацьлеглых бакоў і з'яўляецца тым, што змацоўвае разгрупаваныя свабодныя сеткі ваенізаваных груп, рэгулярных сіл, злачынцаў, наймітаў і фанатыкаў, якія прадстаўляюць шырокі спектр напрамкаў – эканамічнай і/або злачыннай своекарыслівасці, любові да прыгод, асабістай ці сямейнай вендэты ці нават проста захаплення гвалтам. Менавіта ён – тое, што дае ліцэнзію на ажыццяўленне гэтых розных памкненняў. І нават больш:

46 C. Von Clausewitz: *On war*, London: Penguin Books 1968, 24.

гэтыя палітычныя наратывы часта выбудоўваюцца праз вайну. Падобна, як Кляўзэвіц апісаў патрыятызм як тое, што палымнее праз вайну, так і гэтыя ідэнтычнасці выкаваныя праз страх і нянавісць, праз палярызацыю паміж намі і імі. Іншымі словамі, вайна сама па сабе з'яўляецца формай палітычнай мабілізацыі, спосабам аб'яднання, знітавання паасобных элементаў, што арганізаваныя для вайны.

Зразуметая такім чынам вайна – інструмент унутранай палітыкі, а не знешняй. Гаворка ідзе пра ўнутраную палітыку, нават калі гэта палітыка, якая перасякае межы, а не знешняя палітыка дзяржаў. Калі, па Кляўзэвіцу, мэтай вайны з'яўляюцца знешняя палітыка і палітычная мабілізацыя, то ў новых войнах адбываецца наадварот. Мабілізацыя вакол палітычнага наратыву ёсць мэтай вайны, і знешняя палітыка ці палітыка ў адносінах да візаві, якога абвясцілі ворагам, – толькі апраўданне.

Дык што, калі новыя войны – інструмент палітыкі, якую ролю тады адыгрывае розум? Новыя войны з'яўляюцца рацыянальнымі ў сэнсе інструментальнай рацыянальнасці. Але ці ёсць рацыянальнасць тым жа, што і розум? Асветніцкая версія розуму адрозніваецца ад інструментальнай рацыянальнасці. У тым сэнсе, як гэта выкарыстоўваў Гегель (які быў сучаснікам Кляўзэвіца пры жыцці ў Берліне), яна мела нешта рабіць з тым, што дзяржава атаясамліваецца з універсальнымі каштоўнасцямі, як орган, які адказвае за публічнае насуперак прыватнаму інтарэсу. Дзяржава згуртавала розныя групы і класы з мэтамі прагрэсу – дэмакратыі і эканамічнага развіцця. Кляўзэвіц робіць значны акцэнт на ролі ўраду ў распрацоўцы палітыкі і сцвярджае, што галоўнакамандуючы павінен быць членам кабінета. Урад, які за часамі Кляўзэвіца быў групай міністраў, што кансультуюць манарха, быў задуманы, каб адыграць сваю ролю ў аб'яднанні розных інтарэсаў і матывацый і забяспечыць агульныя, публічна важкія аргументы як для самой вайны, гэтак і для яе вядзення. Вядома, у сяброў кабінета былі свае асабістыя матывы, як і ў генералаў (слава, узбагачэнне, рэўнасць і г.д.), але на іх была ўскладзена задача прыйсці да пэўнай згоды, каб забяспечыць афіцыйную пазіцыю ў вайне і каб кіраваць вайной, і гэта мусіла быць заснавана на меркаваннях, якія б з'яўляліся ўніверсальна прымальнымі (пад універсальнымі тут маюцца на ўвазе прыдатныя для грамадзян дзяржавы). У сваім апісанні эвалюцыі прыёмаў вядзення вайны і эвалюцыі дзяржавы, якое пераклікаецца са стадыяльная тэорыяй гісторыі Гегеля, Кляўзэвіц сцвярджае, што толькі ў сучасны перыяд дзяржава можа разглядацца як «разумная істота, якае дзейнічае ў адпаведнасці з простымі лагічнымі правіламі»[47], і што гэта звязана з узрастаннем ролі ўрада, дзе «кабінет стаў поўным адзінствам, што дзейнічае ад імя дзяржавы ва ўсіх яе знешніх стасунках»[48].

Палітычныя наратывы новых войнаў заснаваныя на партыкулярных інтарэсах; яны з'яўляюцца выключальнымі, а не аб'ядна-

[47] Ibid, 342.
[48] Ibid, 344.

льнымі. Яны свядома парушаюць правілы і нормы вайны. Яны рацыянальныя ў інструментальным сэнсе. Але яны не з'яўляюцца разумнымі. Розум мае справу з агульнапрынятымі нормамі, якія ляжаць у аснове нацыянальнага і міжнароднага права.

Аднак ёсць яшчэ адзін аргумент наконт таго, чаму новыя войны з'яўляюцца посткляўзэвіянскімі. Гэта звязана з фундаментальным прынцыпам здумлення Кляўзэвіца – яго паняццем ідэальнай вайны. Яно вынікае з яго вызначэння вайны. «Вайна, – кажа ён, – не што іншае, як двубой у павялічаным маштабе. Калі б мы маглі ўявіць сабе як адзінае цэлае незлічоную колькасць двубояў, якія складаюць вайну, гэта лепш за ўсё зрабіць, уявіўшы двух змагароў. Кожны імкнецца з дапамогай фізічнай сілы прымусіць іншага падпарадкавацца яго волі: кожны спрабуе кінуць свайго саперніка і такім чынам зрабіць яго няздольным да далейшага супраціву. Таму вайна з'яўляецца актам гвалту і намерам прымусіць апанента выканаць нашу волю»[49]. Гвалт, паводле яго слоў, з'яўляецца сродкам. Канчатковая мэта – «абавязковае падпарадкаванне ворага нашай волі», і, каб дасягнуць гэтага, праціўнік павінен быць раззброены.

Далей ён працягвае тлумачыць, чаму гэта павінна прывесці да скрайнасцяў у прымяненні гвалту. «Цяпер філантропы могуць лёгка ўявіць сабе, што ёсць майстэрскі спосаб раззбраення і пераадолення ворага без вялікага кровапраліцця... Аднак як бы гэта ні было падобным да праўды, усё ж такі гэта памылка, якая павінна быць выкараненая; бо ў такіх небяспечных рэчах, як войны, памылкі, якія зыходзяць з духу добразычлівасці, з'яўляюцца найгоршымі. Паколькі выкарыстанне фізічнай сілы ў максімальнай ступені ніякім чынам не выключае сумеснае дзеянне інтэлекту, то адсюль вынікае, што той, хто выкарыстоўвае сілы бязлітасна, не зважаючы на кровапраліцце, у якім прымае ўдзел, павінен атрымаць перавагу, калі яго праціўнік менш энергічны ў іх дастасаванні. Першы тады дыктуе закон апошняму, і абодва імкнуцца да скрайнасцяў, для якіх адзінымі абмежаваннямі будуць тыя, што ўвасобленыя ў колькасці процідзейных сіл з кожнага боку»[50]. Іншымі словамі, унутраная прырода вайны – Абсалютнай вайны – лагічна выцякае з вызначэння, што кожны з бакоў падштурхоўваецца, каб зрабіць новыя намаганні дзеля перамогі над іншым; гэта тое меркаванне, якое Кляўзэвіц падрабязна разглядае ў першай главе, праз што ён называе тры зваротныя дзеянні, у дачыненні да якіх гвалт «выштурхоўваецца да сваіх скрайніх межаў»[51]. Для Кляўзэвіца бой – гэта вырашальны момант вайны.

Рэальная вайна можа адыходзіць ад ідэальнай з розных прычын, але да таго часу, пакуль вайна адпавядае свайму вызначэнню, яна ўтрымлівае логіку скрайнасцяў, і ў другой частцы сваёй кнігі я апісваю, як гэтая логіка прымяняецца да старых войнаў. Менавіта гэтая логіка скрайнасцяў, як я лічу, больш не ўжываецца ў новых

49 Ibid, 5.
50 Ibid, 6.
51 Ibid, 7.

войнах. Таму я перафармулявала вызначэнне вайны. Я вызначыла вайну як «акт гвалту з удзелам двух або больш арганізаваных груп, аформлены ў палітычных тэрмінах». Па логіцы гэтага вызначэння, вайна можа быць альбо «змаганнем воль» (па вызначэнні Кляўзэвіца), ці гэта можа быць «узаемнае прадпрыемства». Згодна з канцэпцыяй «змагання воль», праціўнік павінен быць знішчаны, і такім чынам вайна мае тэндэнцыю да скрайнасцяў. Падыход да разгляду вайны як узаемнага прадпрыемства мае на ўвазе, што абодва бакі маюць патрэбу адзін у другім для таго, каб працягваць «прадпрыемства вайны», і такім чынам вайна мае тэндэнцыю быць доўгай і безвыніковай.

Новыя вайны, як правіла, – узаемныя прадпрыемствы, а не спаборніцтвы воль. Бакі супрацьстаяння зацікаўленыя ў прадпрыемстве вайны, а не ў выйгрышы або пройгрышы, як з палітычных, так і з эканамічных прычын. Унутраная тэндэнцыя такіх войнаў – гэта не вайна без абмежаванняў, але вайна без канца. Войны, вызначаныя такім чынам, ствараюць агульны інтарэс да вайны, які сам сябе падтрымлівае, дзеля ўзнаўлення палітычнай ідэнтычнасці і далейшых эканамічных інтарэсаў.

Як і ў схеме Кляўзэвіца, цяперашнія войны, верагодна, будуць адрознівацца ад ідэальнага апісання вайны. Варожасць, якая запальваецца вайной сярод насельніцтва, можа справакаваць неарганізаваны гвалт ці гаворка можа весціся пра рэальныя палітычныя мэты, якія могуць быць дасягнутыя. Таксама можа быць умяшанне звонку, накіраванае на падаўленне ўзаемнага прадпрыемства, або вайна можа прывесці да нечаканай непрыязнасці да гвалту сярод насельніцтва, падрываючы перадумовы палітычнай мабілізацыі, на якой і заснаваныя такія войны.

Гэта пераазначэнне вайны ўяўляе сабой іншую трактоўку вайны, тэорыю вайны, тэстам для якой будзе тое, наколькі яна дае добрае кіраўніцтва для практыкі. Паколькі гэта ідэальны тып, для падтрымкі тэорыі могуць быць выкарыстаныя прыклады, але гэта недаказальна ў прынцыпе. Пытанне заключаецца ў тым, наколькі такі падыход карысны. Возьмем у якасці прыкладу «вайну з тэрарызмам». Антоніа Эчэварыя не вызначае «вайну з тэрарызмам» у класічных тэрмінах Кляўзэвіца: «Абодва антаганісты імкнуцца да палітычнага знішчэння іншага, і на дадзены момант ніводзін не здаецца адкрытым для ўрэгулявання шляхам перамоваў»[52]. Зразуметы такім чынам, кожны тэрарыстычны акт выклікае ваенны адказ, які, у сваю чаргу, правакуе больш экстрэмальныя контрмеры. Праблема палягае ў тым, што не можа быць аніякага вырашальнага ўдару. Тэрарыстаў нельга знішчыць ваеннымі сродкамі, таму што яны не могуць быць аддзеленыя ад насельніцтва. Тэрарысты таксама не могуць знішчыць вайсковыя сілы Злучаных Штатаў. Але калі мы разумеем «вайну з тэрарызмам» як узаемнае прадпрыемства (якой бы ні была вера асобных антаганістаў), у якім амерыканская

[52] A. Echevarria: *Clausewitz and contemporary war*, Oxford: Oxford University Press 2007, 211.

Адміністрацыя ўмацоўвае свой імідж у якасці абаронцы амерыканскага народа і дэмакратыі, тых, чыя карыслівая зацікаўленасць у высокім вайсковым бюджэце ўзнагароджваецца, і экстрэмісцкіх ісламістаў, здольных абгрунтаваць ідэю глабальнага джыхаду і таму мабілізаваць маладых мусульман, то дзеянне і контрдзеянне толькі садзейнічае «доўгай вайне», якая прыносіць карысць абодвум бакам. Зразуметы ў тэрмінах Кляўзэвіца, прапанаваны курс дзеянняў – гэта поўнае знішчэнне тэрарыстаў ваеннымі сродкамі. Зразуметы ў посткляўзэвіцыянскай тэрміналогіі, прапанаваны курс дзеянняў можа вельмі адрозніваецца; ён тычыцца як прымянення закона, так і мабілізацыі грамадскай думкі, і не ў падтрымку аднаго або іншага боку, але супраць вайны як узаемнага прадпрыемства.

Кантраст паміж старымі і новымі войнамі, разгледжаны тут, такім чынам, з'яўляецца хутчэй супрацьлегласцю паміж ідэальнымі тыпамі вайны, а не паміж рэальным гістарычным вопытам. Вядома, войны дваццатага стагоддзя па меншай меры ў Еўропе былі блізкія да старога ідэала вайны, а войны дваццаць першага стагоддзя бліжэйшыя да майго апісання новых войнаў. Сучасныя войны не могуць насамрэч адпавядаць гэтаму вызначэнню больш, чым ранейшыя войны адпавядалі старому вызначэнню вайны. Магчыма, яшчэ адзін спосаб апісаць розніцу – паміж рэалістычнай інтэрпрэтацыяй вайны як канфліктаў між групамі (звычайна дзяржаў, якія дзейнічаюць ад імя ўсёй групы як цэлага) і інтэрпрэтацыяй вайны, у якой паводзіны палітычных лідараў разглядаюцца як выражэнне комплексу многіх палітычных і, верагодна, бюракратычных сутыкненняў як тых, хто дамагаецца сваіх прыватных інтарэсаў ці інтарэсаў сваёй фракцыі або фракцый, а не тых, хто дзейнічае дзеля ўсіх. Можна сцвярджаць, што ў Вэстфальскую эпоху суверэнных нацыянальных дзяржаў рэалістычная інтэрпрэтацыя мела большую актуальнасць, чым сёння.

Гэтае канцэптуальнае адрозненне не зусім той самы шлях, якім я першапачаткова апісвала новыя войны з пункту гледжання ўдзелу ў іх недзяржаўных суб'ектаў, ролі палітыкі ідэнтычнасці, размывання адрозненняў паміж вайной (палітычны гвалтам) і злачынствам (гвалтам у прыватных інтарэсах), а таксама таго, што ў новых войнах бітвы рэдкія і гвалт у асноўным скіраваны супраць грамадзянскага насельніцтва[53]. Але тое не супярэчыць ранейшаму апісанню і проста прадугледжвае вышэйшы ўзровень абстракцыі.

### Высновы

Дэбаты аб новых войнах дапамаглі ўдакладніць і перафармуляваць аргументацыю. Спрэчкі адносна Кляўзэвіца спрыялі стварэнню больш канцэптуалізаванай інтэрпрэтацыі новых войнаў, у той час як дэбаты пра дадзеныя прывялі да выяўлення новых крыніц доказаў, якія б дапамаглі абгрунтаваць асноўнае палажэнне.

[53] M. Kaldor: *New and old wars: Organised violence in a global era*, 2nd edition, Cambridge: Polity Press 2007.

Адзінае, у чым крытыкі, як правіла, згодныя, – што канцэпцыя «новых войнаў» была важная для адкрыцця новага шляху навуковага аналізу і новых палітычных перспектыў, у чым, як я ўжо падкрэслівала, і быў сэнс аргументацыі[54]. Дэбаты дазволілі пайсці далей. Гэта спрыяла росту вобласці даследаванняў канфліктаў. І аказала ўплыў на інтэнсіўныя палітычныя дэбаты, якія адбываюцца перш за ўсё ва ўзброеных сілах, міністэрствах абароны і міжнародных арганізацыях – дэбаты ў Пентагоне аб барацьбе з паўстанцамі, напрыклад, ці пра бяспеку чалавека ў Еўрапейскім саюзе і нагсамрэч аб нетрадыцыйных падыходах да бяспекі ў цэлым.

Тым, чаго яшчэ не стае гэтай дыскусіі, з'яўляецца запыт на касмапалітычную палітычную рэакцыю. У рэшце рэшт, паліцыя, вяршэнства закона, механізмы правасуддзя ды інстытуцыянальнага будаўніцтва залежаць ад распаўсюджвання нормаў на мясцовым, нацыянальным і глабальным узроўнях. А нормы будуюцца як за кошт навукі, так і за кошт грамадскіх дыскусій. Калі мы хочам пераасэнсаваць палітычны гвалт як новую вайну ці злачыннасць і ўжываць сілу хутчэй у якасці касмапалітычных праваахоўных органаў, а не для ваенных баявых дзеянняў, то мы павінны мець магчымасць аспрэчыць сцверджанні тых, хто канцэптуалізуе палітычны гвалт як старую вайну, і гэта можа быць зроблена толькі праз крытычны публічны аналіз.

*Пераклад з англійскай Ліліі Ільюшынай*

[54] E. Newman: The 'new wars' debate: A historical perspective is needed, in: *Security Dialogue,* 35, 2 (2004), 173–189. Рэжым доступу: http://dx.doi.org/10.1177/0967010604044975. Дата доступу: 20.01.2017; E.A. Henderson, D. Singer, op. cit.